# ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

УДК 929:01/02(476) Лявончыкаў В.Е.

## Да юбілея Васіля Емяльянавіча Лявончыкава



Споўнілася 80 гадоў Васілю Емяльянавічу Лявончыкаву – доктару педагагічных навук, прафесару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, акадэміку Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН (г. Масква), члену-карэспандэнту Беларускай акадэміі адукацыі.

Нарадзіўся В. Е. Лявончыкаў 27 мая 1937 г. у г. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. З 1954 г. па кастрычнік 1955 г. працаваў інструктарам раённага аддзела культуры па культасветрабоце, а з кастрычніка 1955 г. па 1958 г. дырэктарам районнага Дома культуры г. Чэрыкава Магілёўскай вобласці, пасля – дырэктарам раённага Дома культуры ў г. Слаўгарадзе. Некаторы час працаваў адборшчыкам літаратуры ў Аблкнігагандлі г. Мінска, загадчыкам бібліятэкі вайсковай часці. У 1962 г. скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

Педагагічная дзейнасць В. Е. Лявончыкава пачалася ў кастрычніку 1962 г. у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага на бібліятэчным факультэце, дзе ён выкладаў шмат дысцыплін бібліяграфічнага цыклу. Працаваў спачатку ў якасці выкладчыка, з 1964 г. – старшага выкладчыка і намесніка дэкана бібліятэчнага факультэта, а з 1971 г. – дацэнта кафедры бібліяграфіі, дэкана бібліятэчнага факультэта. З адкрыццём у 1975 г. Мінскага інстытута культуры быў прызначаны на пасаду дэкана бібліятэчнага факультэта, а з 1983 г. абраны прафесарам кафедры бібліяграфіі і яе загадчыкам. Узначальваў кафедры бібліяграфіі, бібліяграфіі і дакументазнаўства, тэорыі і гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйна-дакументных камунікацый В. Е. Лявончыкаў больш за 26 гадоў. Агульны педагагічны стаж складае звыш 50 гадоў.

У навукова-педагагічнай дзейнасці праявіўся яго талент буйнога вучонага і арганізатара падрыхтоўкі кадраў. В. Е. Лявончыкаў першым у Беларусі абараніў не толькі кандыдацкую дысертацыю ў галіне бібліяграфазнаўства, але і стаў першым і пакуль адзіным доктарам навук у гэтай галіне даследаванняў. Ступень кандыдата навук яму была прысуджана за абарону дысертацыі на тэму «Агульная рэтраспектыўная бібліяграфія кніг Беларусі: гісторыя і тэарэтычныя пытанні» (1969), падрыхтаваную падчас навучання ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры пад кіраўніцтвам вядомага бібліяграфаведа прафесара А. Д. Эйхенгольца. У хуткім часе выйшла ў свет манаграфія «Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг». У 1988 г. у г. Маскве В. Е. Лявончыкаў абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі саюзнай рэспублікі: тэарэтыка-метадалагічныя праблемы». Вынікі гэтага даследавання знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі «Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі саюзнай рэспублікі».

Сёння Васіль Емяльянавіч працягвае выкладаць на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый агульнапрафесійныя і спецыяльныя вучэбныя дысцыпліны: «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі», «Асновы навукова-даследчай работы», «Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліяграфазнаўства, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства». Магістрантам і аспірантам ён дапамагае авалодаць метадалогіяй навуковых даследаванняў.

Навуковыя інтарэсы В. Е. Лявончыкава вельмі шырокія і заўжды накіраваны на асэнсаванне трансфармацый бібліяграфіі і бібліятэчнай справы ў адпаведнасці з патрэбнасцямі грамадства. Гэта тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліяграфазнаўства, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства, гісторыя беларускай бібліяграфіі, бібліятэчная адукацыя, інфармацыйная культура, бібліятэчная камунікатывістыка, інфармацыйная свабода і інфармацыйная бяспека, бібліятэкі ў сістэме бесперапыннай адукацыі, інфармацыйныя адукацыйныя рэсурсы і інш. Адметныя рысы ўсіх яго прац – грунтоўнасць метадалагічнай і фактаграфічнай асновы, дакладнасць даследчых мэтаў, выкарыстання паняційнага апарату і сістэмы навуковай аргументацыі, тэарэтычная і практычная навізна і значнасць.

Напружаная навуковая і вучэбна-метадычная дзейнасць паспрыяла падрыхтоўцы вялікай колькасці навуковых і вучэбна-метадычных прац. Васіль Емяльянавіч з'яўляецца аўтарам 4 манаграфій, 2 вучэбных дапаможнікаў, шэрагу тыпавых праграм, артыкулаў па тэорыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыі, методыцы беларускай бібліяграфіі, праблемах бібліятэчных камунікацый, бібліяграфічнай дзейнасці ў сістэме бесперапыннай адукацыі; першага выдадзенага ў Беларусі «Руска-беларускага слоўніка бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у суаўтарстве с Л. А. Дзямешка) і «Тлумачальнага слоўніка бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у суаўтарстве з Л. А. Дзямешка і Р. І. Саматыем). Агульная колькасць апублікаваных работ складае каля 300.

Васіль Емяльянавіч надае вялікую ўвагу падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Ён быў адным з арганізатараў стварэння аспірантуры ў БДУКМ, дзе абіраўся старшынёй і намеснікам спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Пад яго непасрэдным навуковым кіраўніцтвам былі абаронены шэсць кандыдацкіх дысертацый: В. І. Саітавай, прафесарам БДУКМ; Т. В. Кузьмініч, намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дацэнтам; І. В. Дрыгай, намеснікам міністра культуры Рэспублікі Беларусь; А. В. Прадзеінай, прарэктарам Інстытута культуры Беларусі, дацэнтам; Ібрагімам Бадарханам, грамадзянінам Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, дацэнтам Курдскага ўніверсітэта (Ірак); Ж. Л. Раманавай, старшым выкладчыкам БДУКМ.

Прафесар В. Е. Лявончыкаў стваральнік навуковай педагагічнай школы ў галіне бібліяграфазнаўства, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства, прадстаўнікі якой працуюць у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, БДУКМ, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Нацыянальнай кніжнай палаце, рэспубліканскіх галіновых, абласных, раённых, гарадскіх бібліятэках. За час існавання навуковай школы былі абаронены адна доктарская (Р. С. Матульскі) і 19 кандыдацкіх дысертацый. Сярод уладальнікаў вучонай ступені кандыдата педагагічных навук – пяць грамадзян замежных краін: Іарданіі, Ірака, Камеруна, Сірыі.

Побач з плённай навуковай і вучэбна-метадычнай працай ідзе грамадская работа Васіля Емяльянавіча. Ён член рэдкалегіі навуковага зборніка «Бібліятэчны веснік» (НББ), навуковага часопіса «Веснік БДУ культуры і мастацтваў», часопіса «Бібліятэчны свет». Яго імя ўключана ў слоўнік «2000 Outstanding Scientists of the 21st Century» (Cambridge, 2005) Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кэмбрыджы і ў даведнік «Кто есть кто на академическом Олимпе» (г. Москва, 2004) Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН.

Вучоны ўнёс вялікі ўклад у стварэнне грамадскай арганізацыі бібліятэчных спецыялістаў – Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, першым прэзідэнтам якой ён быў на працягу 1992–1993 гг., а зараз з'яўляецца яе ганаровым членам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

За плённую дзейнасць В. Е. Лявончыкаў узнагароджаны ордэнам СССР «Знак Почета», медалямі «За доблестный труд», «В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина», «Ветеран труда», нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі.

Сёння Васіль Емяльянавіч па-ранейшаму нязменны навуковы лідар, мэтанакіраваны і настойлівы ў сваіх пошуках, адказны і патрабавальны да сябе і калег, настаўнік, дарадца і выхавацель некалькіх пакаленняў бібліятэкараў краіны.

Рэктарат, выкладчыкі ўніверсітэта, калегі Васіля Емяльянавіча, яго вучні адрасуюць юбіляру найлепшыя віншаванні і пажаданні новых навуковых здзяйсненняў, таленавітых вучняў, добрага здароўя і настрою!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ